Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 914641

# ДУМКІ АБ КАНДЫДАТАХ У ПРЭЗЫДЭНТЫ

Пачалася рэгістрацыя ініцыятыўных груп

За нумарамі І і 2 Цэнтральная выбарчая камісія ужо зарэгістравала бальшэвіцкія і прабальшэвіцкія групы,у іх 3.920 чалавек будуць працаваць на бышага члонка ЦК КПБ, цяперашняга прэм'ер-міністра РБ В.Кебіча.А 3041 - за Васіля Новікава.Бальшэвікі паказалі масавасць,арганізаванасць,напорыстасць,тугу да настальгіі па міражы "светлага будучага".Іх прынцып: мы занімалі,занімаем і будзем занімаць першыя месцы у палітычным жыцці свайго камуністычнага запаведніка - Беларусі.Яны жывучы як каларадскія жукі,як канадская зараза.Іх стаўка на старую бальшэвіцкую гвардыю,ветэранаў сілавых міністэрстваў,адміністратыўна і залежна падначаленыя слаі грамадства,на галаву запужаных сельскімі дзяржаўнымі феадаламі саўгаснікаў і калгаснікаў па прынцыпу: прагаласуеш "за" - дам каня,не прагаласуеш - не дам,здохніш.

Дэмакраты ужо адцісьнуты на 3-я і 4-я месцы. За С.Шушкевіча будуць змагацца 1420 чалавек,а за З.Пазняка - ініцыятыўная група із 2734 чалавек.Ўуна меньш,чым у першых 2-х групах.Так і хочацца крыкнуць: гдзе вы_патрыёты сваей бацькаўшчыны і дэмакраты!? Іх(дэмакратаў і патрыетаў) ужо бальшэвікі абхідрылі(на гэты конт вопыт у іх вялікі),паставіўшы у экстрамальныя умовы па тэрміну стварэння ініцыятыўных груп і збору подпісаў.

Бог беларусаў нічым не абдзяліў,акрамя лідэрамі нацыі.
Хто ж,на маю думку,нашы кандыдаты у прэзыдэнты?

І.В.Кебіч . Гэта ня толькі аналаг,але амаль і блізнец па выразу твару даўно ужо спачыўшаму лідэру Катангі у бышым бельгійскім Конга - ЧОМБЭ. Кебіч,як і згаданы лідэр із далекай Афрыкі са сваей зграяй рашуча ператварае нашу родну Беларусь у правінцыю "Бэльгіі" - Расіі. Якой "квітнеючай" пры ім - прэм'еры стала наша Краіна: людзі ужо грошы носяць не у кашальках,а у кашолках і сумках каб купіць звычайныя прадукты.А у многіх - ні працы,ні грошы.Толькі за спорчаную на грошы паперу В.Кебіч не мае маральнага права прэдэнтаваць на пасаду ПРЭЗЫДЭНТА А гаварыць ён со сваім беларускім народам на мове чужынцаў - рускай. Які ж гэта ПРЭЗЫДЭНТ?! В.Кебіч - гэта беларускі ЧОМБЭ!

2.В.Новікаў.- Што-та не магу прыпомніць,што такога выдаючага зрабіў ён для Беларусі.Новікаў за незалежнасць яе ніколі не змагаўся,ні у турмах,ні у канцлагерах для палітычных вязняў не сядзеў,ні у псіхушцы ня быў,галадовак не аб'яўляў і нам беларусам зусім не вядома яго прэзыдэнтская праграма.В.Новікаў для беларускага народа - гэта кот у мяшку.

3.С.Шушкевіч. Ён хоча быць падобным на Чэрчыля.А Р.Рэйган гаварыў:"Як

vytoki.net

можна быць прэзыдэнтам,не будучы артыстам(сам ён раней быу артыстам)?"
Уся бяда у тым,што С.ШушкевIч не артыст,а фIзык - з аналIтычным складам ума,але для прэзыдэнта гэтай патрэбнай якасцI яшчэ аказываецца мала: трэба быць I артыстам,хаця бы такIм,як В.КебIч, цI, А.Лукашэнка. Iз сумленных людзей - нIхто не скажа,што С.ШушкевIч нядобрасумленны чалавек.Па гэтай якасцI ён дауно Прэзыдэнт.УмеIць I з людзмI ладзIць, абяцае,што не будзе I мямляй.Ён запраудны патрыёт БеларусI,палIтык. Ён можа паутарыць лёс ня толька Чэрчыля,але I КлIнтана,якога на другI срок нават губернатарам не выбралI,але ён веручы у свае сIлы не разгубIуся I пайшоу к сваIм выбаршчыкам пытацца,чым яны Iм незадаволяны,чаму супраць яго прагаласавалI.УлIчыу усе Iх абIды,скаргI,незадаволеннасцI I у наступны раз яго узноу выбралI губернатарам у тым жа самым штаце, а потым I прэзыдэнтам ЗША.

4.З.Пазняк. Па-мойму,гэта беларускI Лумумба,цI,Ландсбергес.Выбяруць яго ПРЭЗЫДЭНТАМ цI не выбIруць,але у душэ кожны сумленны беларус лIчыць I будзе лIчыць яго сваIм ПРЭЗIДЭНТАМ.Гэта палямяны ПАТРЫЁТ I непрымIрымы вораг кроважадный камунIстычнай IдэалогII.На яго беларуская нацыя можа смела ставIць I ён выканае яе волю: не дапусцIць каб беларусы у сваIм уласным доме былI на задворках,а амаль палавIна Вярхоунага савета I другIх урадавых структур складалI чужынцы-каланIзатары,аплёвываючы нашы гэрб,сцяг,мову,незалежнасць,суверэнIтэт I г.д.

Астальныя прэтэндэнты на пасаду ПРЭЗЫДЭНТА рэспублIкI павIнны згадзIцца з тым,што на гэту высокую пасаду прэтэндаваць не могуць,як бы Iм не хацелася.Ды навогул,калI хочаш заняць высокую пасаду,перш падумай а цI ня ёсць на яе больш дастойны чалавек.

Жоровiч